Год II. Пятніца, 25 лютага (феураля) 1921 г. № 8.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыдневая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. Цана асоб. нумэру 6 марак. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Адозва да Амэрыканскіх беларусаў.

Грамадзяне! Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт, ведаючы, што множства беларусаў, якія жывуць у Новым Сьвеце, з вялікім почуцьцём і інтарэсам цікавяцца нашым змаганьнем з чужынцамі за нацыянальнае адраджэньне бацькаўшчыны і вызваленьне яе ад няволі,—даводзіць да вашага ведама, што гэта барацьба наша знаходзіцца ў вельмі цяжкіх варунках і патрабуе ад вас ў як найхутчэйшым часе перш-на-перш матар'яльнае дапамогі.

Браты! Вы ўжо з газэт ведаеце, што на тэрыторыі Беларусі безперастанку ідзе сем гадоў вайна, і наш край за апошні час зусім абгалеў: ёсьць месцы, дзе зьнішчаны і спалены ўсе пасёлкі, начыста парыты на акопы ўсе палі, і людзі павінны жыць ці ў зямлянках, ці ў часовых, напасьпех скалочанных халупах. Жывёла часткай была рэквізована, часткай зусім прапала ад бяскорміцы. Няма ні хлеба дзеля людзей, ні корму дзеля скаціны, усё рэквізована ці проста забрана, і зьедзена акупацыйным войскам. Куды ні зьвернешся—усюды голад: шмат людзей чакае толькі, каб хутчэй растаў сьнег і можна было-б дастаць для сябе якога-кольвек зельля з зямлі.

Зразумела, што ў самым горшым становішчы знаходзяцца дзеці. Трэба іх вучыць, але недзе прытуліцца, няма грошы плаціць вучыцялём, няма паперы і падручнікаў. Трэба было-б накарміць іх, калі дома нечага есьці, але няма ні дзяціных харчэўняў, ні якой другой дапамогі збоку. Тэй дапамогі, якую дае Амэрыканскі народ, не хапае, бо яна цалком ідзе на падтрыманьне дзяцей ў гарадох і польскіх школах, а да беларускіх вясковых дзяцей нічога не даходзіць.

Вось дзеля гэтага Нацыянальны Камітэт зварочваецца да вас з просьбаю аб дапамозе.

Вы павінны ведаць, што гэтая дапамога ад вас будзе мець ня толькі матар'яльнае, але і моральнае значаньне: яна падтрымае нашу пазіцыю аб'яднаньня ўсіх беларусаў ў адну магутную сям'ю, з катораю павінны будуць усе лічыцца. Апроч таго, ваша дапамога вызваліць ад голаду, хваробы і сьмерці дужа многа дзяцей, утрэ ў многіх абяздоленых сьлёзы і дасьць тысячам дзяцей магчымасьць стаць на ногі і атрымаць пачаткі асьветы.

Рабіць гэту дапамогу можна праз Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт, каторы возьме на сябе абавязак падзяліць паміж патрабуючымі атрыманыя сумы.

Але хто мае сваіх родных і знаёмых у Віленшчыне, ці наагул у Беларусі, няхай таксама сьпяшыць з дапамогаю і няхай не баіцца, што ахвяра малая: амэрыканскія грошы стаяць тут вельмі высока: колькі-небудзь доляраў вызваляць цэлую сям'ю ад апошняга зьнішчэньня і голаду.

Усе, каму дарага справа беларуская, ідзіце на помач як найхутчэй, час не чакае. Няхай кожны з вас ведае, што дапамога вашым братом ёсьць доўг ваш перад сваей бацькаўшчынаю.

Да тых беларусаў, да каторых дойдзе гэтая адозва, Камітэт зьвяртаецца з просьбаю пашырыць яе праз сваіх знаёмых, а асабліва было-б пажадана намесьціць гэтую адозву ў той прэсе, якая чытаецца сярод беларускага грамадзянства ў Амэрыцы.

Віцэ-Старшыня Віленскага Беларускага Нацыян. К-ту **А. Карабач**
Сэкрэтар **М. Кахановіч.**

Плебісцыт, — але калі?

Калі нас, беларусаў Віленшчыны і Горадзеншчыны, хацелі раптам „далучыць“, не запытаўшыся нашай волі, або калі хацелі сфальшаваць волю людпасьці нашага краю іншым спосабам (Віленскі Сойм), то мы рашуча адкідалі нягодныя папыткі нашых ворагаў і, як маглі, пры самых цяжкіх для нас варунках сучаснага жыцьця, змагаліся за свае святыя правы.

Але, калі—пасьля правалу усіх варожых нам папытак тым ці іншым спосабам нас далучыць—нашы супраціўнікі змушаны цяпер у канцы канцоў ісьці на плебісцыт, то мы,—хоць і лічым, што край наш быў і ёсьць край літоўска-беларускі, а ня польскі, — усё-ж даём сваю згоду на плебісцыт. Няхай тыя польскія элемэнты, якія цягнуць да Польшчы, папрабуюць свае сілы ў варунках поўнай раўнапраўнасьці змагаючыхся старон, бяз помачы „Стражы Крэсовай“ і іншых экспозітур польскай далучэнчаскай палітыкі.

Няхай пазволена будзе і нам, і ліцьвіном, і жыдом пагаварыць з сваімі народнымі масамі і растлумачыць ім усёй не па польска - эндэцкай катэхізьме, а па праўдзе, як яно ёсьць.

Няхай пачуецца і наш голас, няхай ён дойдзе і зразумеецца ў самых цёмных і глухіх кутках самымі адсталымі і цёмнымі людзьмі.

Разумеецца, што каб голас наш пачуўся у народзе, — патрэбна поўная зьмена кіруючага у сучасны момэнт адміністрацыйнага апарату, а пасьля таго досыць доўгі працяг часу, каб ураўнаважыць шанцы змагаючыхся старон. Польска-эндэцкія элемэнты добра разумеюць, што праўдзівае усьведамленьне народных мас прывядзе к краху іх палітыкі, і яны паміж сабой моцна завярушыліся і крычаць аб як найскарэйшым плебісцыту, бо гэта ім выгодна і вось чаму.

Дзякуючы ненормальным варункам сучаснага жыцьця, пры каторых ні беларусы ні ліцьвіны ні навет некаторыя польскія палітычныя групы не маглі свабодна агітаваць у народзе, чым амаль выключна карысталіся эндэцка-страж - крэсоўскія польскія элемэнты, ува многім народ нашае зямлі не разьбіраецца, або мяркуе абмылкова.

Возьмем, напрыклад, хоць бы такі факт: Пытаешся:—„Якой веры?“ Адказвае:—„Польскай“. — „Такой веры няма“,—кажам яму, ёсьць вера: каталіцкая, праваслаўная, іудзейская і іншыя:—„Так, так, я каталік, значыцца, польскай веры.“ —Пачынаеш тлумачыць чалавеку, што каталікі ёсьць ня толькі палякі, а і ліцьвіны, і частка беларусаў, і французы, і італьлянцы, і многа іншых народаў. З вялікім трудам удаецца ў канцы канцоў уцяміць такому „чалавеку каталіцкай нацыянальнасьці і польскай веры“, хто ён такі.

А паслухайце, што гаворыць які-небудзь цёмны вясковы эндэцкі падгалосак пра ліцьвіноў, беларусоў і жыдоў.—„Ліцьвіны — гэта паганцы, яны ў Хрыста ня вераць... Беларусы—тыя самыя маскалі, бальшавікі“ — і гэтак далей, Жыды... лепей мы устрымаемся ад перадачы усіх „прыгожых“ слоў, якія ужываюцца такім чалавекам у адносінах да жыдоў

Вось што пасеена ў народзе, хоць далёка не ўва ўсім, польскімі рэакцыйнымі элемэнтамі і іх агентамі.

Трэба-ж падыйсьці да такога атручанага цёмнага люду з іншымі словамі, ня тымі што яму насьпявалі рэакцыянэры, а для гэтага патрэбен досыць доўгі час культурна-палітычнай працы сярод народу.

Так мы думаем і з гэтай прычыны павінны дабівацца, каб плебісцыт адбываўся ў нас не у найскарэйшым часе, а як можна пазьней, — пасьля таго, як народ будзе пазбаўлен польска-эндэцкай атруты.

Нам няведама, наскольki праўда тое, што Літоўскі Урад у Коўні зьвярнуўся да Лігі Народаў з прапазыцыяй, каб плебісцыт адбыўся у нас не раней, як праз восем месяцаў пасьля прыбыцьця на плебісцытную тэрыторыю паміжнародных войскаў.

Калі гэта праўда, то Літоўскі Урад знойдзе падрыманьне у гэтым пытаньні і з беларускага боку.

Што-ж датычыць таго, што Віленскі Магістрат (ня ўвесь, а толькі яго эндэцкая часьціна) паслаў у Парыж да Рады Лігі Народаў сваю дэлегацыю з трох асоб, каб дабіцца там „н а й с к а р э й ш а г а праправаджэньня консультацыі“ (г.-ё. плебісцыту), то нам больш за ўсе шкада тэй вялікай сумы грошаў, якая будзе затрачана на пасылку дэлегацыі, і ляжа на кішэні не аднэй толькі віленскай эндэцыі, а і ўсіх нас.

Але нам зусім ня будзе шкада паноў эндэкаў, калі ня ў першы ўжо раз ім у Парыжы не пашанцуе і „найскарэйшага“ эндэцкага плебісцыту яны не даб'юцца.

Прывучайцеся чакаць, панове эндэкі, як мелі цярплівасьць чакаць вынікаў вашай далучэнчаскай палітыкі ўсе мы.

Віленчук.

Палітычнае становішча Беларускае Народнае Рэспублікі.

Нашаму супрацоўніку ўдалося быць на паседжаньні аднэй заграпічнай беларускай арганізацыі, на якім прадстаўнік ураду Беларускае Рэспублікі грамадзянін Чарапук рабіў даклад аб сучасным палітычным становішчы Беларусі. З гэтага даклада маем гэткія весткі.

Эсэраускі урад.

Цяперашні ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі, на чале якога стаіць выдатны беларускі дзеяч социяліст-рэвалюцыянэр Вацлаў Ластоўскі, ёсьць па свайму складу эсэраўскі. Апрача социял.-рэвалюцыянэраў, у ім ёсьць толькі адзін эсэф (социял.-фэдэраліст) і адзін народны социяліст. Урад абпіраецца на партыю і разам з ёю вядзе змаганьне за нацыянальнае і клясавае вызваленьне бацькаўшчыны. Пайменны склад ураду гэткі: старшыня—Ластоўскі, міністр заграничных спраў — Ладноў, унутраных спраў—Тамаш Грыб, справядлівасьці — Цьвікевіч, грашовых спраў — Бялевіч, а за яго адсутнасьцю поўніць абавязкі Валькевіч, дзяржаўны кантралёр—Заяц і г. д.

Адносіны да Літвы.

Найлепшыя адносіны мае цяперашні ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі з урадам Літоўскае Рэспублікі дзякуючы ўмове, зробленай 12-га лістапада 1921 г. ў Коўні. Раней палітычная работа некаторых літоўскіх дзенчаў была моцна памылковая; яны думалі, што адкінуўшы беларусаў, лягчэй здабудуць сталіцу Вільню, і дзеля гэтага шкодзілі беларускай справе заграніцай. Аднак, разумны кірунак болей дальнавідных літоўскіх палітыкаў з дапамогаю зьмененай палітычнай абстаноўкі перамог, і паволі пачалося беларуска - літоўскае зближэньне. Урэшце была зроблена ўмова, маючая вялікую дыплёматычную і іншую карысьць дзеля абедзьвюх старонак. Водле гэтае ўмовы пытаньні аб беларуска-літоўскіх граніцах астаюцца адкрытымі да таго часу, калі зможаць сабрацца беларускі ўстаноўчы сойм. Памысным рэзультатам гэтае ўмовы дзеля беларусаў ёсьць тое, што ёю Беларуская рэспубліка прызнаецца з боку Літоўскае рэспублікі і фактычна і праўна, а беларускі ўрад мае права афіцыяльнага быцьця на беларуска - літоўскім прасторы, і цяпер, ня гледзячы на пратэсты бальшавікоў, знаходзіцца ў Коўні. Значаньне беларуска-літоўскае ўмовы як належыцца запаніла акуратная і практычная нямецкая прэса; выдатныя нямецкія публіцысты глядзяць на гэтую ўмову, як на факт гістарычнае важнасьці.

Цяпер, як сказаў грам. Чарапук, беларуска-літоўскія адносіны маюць сардэчны характар. У часе прамовы міністра Пурыцкіса у Сойме, усе дэпутаты горача віталі сядзеўшых там прадстаўнікоў Беларускае Народнае Рэспублікі.

Адносіны з Саветамі.

Урад Ластоўскага стаіць супроць ураду Савецкае Беларусі на чале з беларускім камуністам Аляксандрам Чарвяком, аб якім кажуць, што ён ня любіць крыві, глыбака прыняты ідэямі камунізму, любіць беларускую народную культуру і выдзяляецца моцнай воляй і нязломнай энэргіяй. Ня гледзячы па цьвёрда-беларускае становішча гэтага чалавека, незалежнае становішча Савецкай Беларусі праз дзеяльнасьць камуністаў іншага гатунку надта слабое, і гэтая акалічнасьць дае вялікую перавагу на міжнародным пляне ўраду Ластоўскага. Каб аслабіць моральнае значаньне заяў Ластоўскага ў заграпічнай прэсе, бальшавікі ў астатні час надта многа робяць дзеля беларускае школы, тэатра і літэратуры. У астатні час, апрача таго, бальшавікі пад уплывам дзеяльнасьці Ластоўскага ў Эўропе, як сказаў грам. Чарапук, змушаны былі пасьпяшыць з аддачаю Савецкай Беларусі Смаленшчыны, Віцебшчыны і Магілеўшчыны, далучаных калісь да Маскоўшчыны,

Аб аб'яднаньні гэтых беларускіх земляў з савецкім беларускім асяродкам у Менску афіцыяльна заявіў у Коўні бальшавіцкі пасол Аксельрод.

Такім чынам ад змаганьня Ластоўскага з Чарвяком пачалося зьбіраньне Беларусі.

Адносіны да урадау іншых старонак.

У Лацьвіі заграничную палітыку робяць польскі пасол Камянецкі і бальшавіцкі—Ганецкі. Пад прынукаю палітычных акалічнасьцяў латышы змушаны былі дзеля прыемнасьці Ганецкага афіцыяльна паведаміць урад Беларускае Народнае Рэспублікі, што ім некарысна быцьцё ў Рызе яго прадстаўнікоў. Але прыязныя адносіны латышоў да беларускае работы ад гэтага паведамленьня не зьмяніліся, і работа йдзе бяз вывескі таксама, як ішла пад вывескай.

Адносіны да ўраду Польшчы, якія былі раней і ёсьць цяпер, вымагаюцца захватнымі мэтамі польскіх палітыкаў Ясна, што польскім паном няма ніякага інтарэсу рабіць мужыцкую Беларускую Рэспубліку. Вялізманая старонка, насялёная рэвалюцыйным сялянствам, сплочаным агульнасьцю клясавых інтарэсаў і нацыянальным пачуцьцём, магла-бы на іх здань пагражаць навет спакою самой Польшчы, а насамперад — спакойнаму жыцьцю польскіх паноў, маючых двары ў Беларусі. І вось, хаця была поўная магчымасьць „стварыць“ Беларусь, хоць бы самую „куртатую“, на рыскіх перагаворах, — паны далажылі ўсіх стараньняў, каб ніякай Беларусі ня было. Прадстаўнікі савецкай дэлегацыі ў Рызе так і казалі, што тэрыторыяльныя варункі польскай дэлегацыі былі дзеля іх неспадзяванкаю, што яны чакалі з боку польскіх прадстаўнікоў жаданьня стварыць „буржуазную“ Беларусь з граніцамі, адсунутымі дзеля спакою польскіх паноў як можна далей на ўсход. Тое, што зрабілі польскія прадстаўнікі дзеля беларусаў у Рызе, дужа ўзмацніла ранейшую пазыцыю ўраду Ластоўскага да Польшчы, прыдбала яму шмат дзейных прыхільнікаў і аканчальна ўтапіла ў балота палякуючую групу беларускіх дзе-кс. ячоў, якія цяпер-ка знайшліся ў моцна ганебным «тупіку» і ня ведаюць, як з яго вылезьці.

Адносіны з сучаснай Нямеччынай добрыя. Нямецкі ўрад прызнае de fakto (фактычна) беларускае прадстаўніцтва і робіць дзеля яго ўсё, на колькі дазваляе версальская ўмова. Беларуская заграмічная работа вельмі памысна разьвіваецца ў Бэрліне і ў будучыне суліць культурна - нацыянальнаму беларускаму адраджэньню шмат чаго дужа добрага.

Францыя глядзіць на Беларусь так, як таго хоча сучасны польскі ўрад, але ёсьць і там палітычныя колы, што шукаюць зусім іншых адносін з Беларусьсю.

У Англію едзе новае дыплёматычнае прадстаўніцтва, і аб адносінах з ангельскім урадам чакаюцца памысныя паляпшэньні ў бліжэйшым часе, хаця і цяпер адносіны не благія.

У Амэрыку едзэ дэлегацыя ў лікуі 5 асоб. З беларускім грамадзянствам ў Амэрыцы зьвязкі ёсьць, і рэзультатам гэтых зьвязкаў насамперш трэба чакаць моцнай матар'яльнай дапамогі бацькаўшчыне.

Выдавецтва.

У заключэньне грам. Чарапук, даткнуўшыся унутраных спраў, пацешыў сабраных, што ўрад Ластоўскага асыгнаваў вялікія грошы на выданьне беларускіх падручнікаў для школ.

Аб беларускай культуры.

Пад словам культура разумеюць усё тое, што гэты ці той народ стварыў за ўвесь час свайго існаваньня ў навуцы, літэратуры і мастацтву. Тут я ня буду пералічаць усіх скарбаў культурнае творчасьці беларускага народа з яго мінуўшчыны і цяперашчыны, але хачу толькі адказаць на тыя абразьлівыя дзеля нас, беларусаў, абвінавачаньні, якія трапляецца часта слухаць з боку нашых суседзяў, галоўным чынам палякоў, як ад-кс. Мацеевіча ў Варшаўскім Сойме і інш. Яны гаворыць, што ў нас няма ні літэратуры, ні мастацтва, ні мовы... Словам, няма і беларусаў. Гэтае абвінавачаньне ў гэткай-жа меры крыўдна чуць, як беднаму, згаладнеламу, ледзьве стаячаму на нагах ля багата а ганку старцу-жабраку пачуць загадлівы голас пана да сваіх слугаў: „Турыце яго вон у каршэнь! Хіба вы ня бачыце, што ён п'яны і ледзьве на нагах стаіць!“

Зусім правільна, у нас пакуль што няма тае культуры, якую павінны былі-б мець і маглі-бы мець.

А чаму?

Адказ на гэтае пытаньне дасьць нашым ворагам гісторыя нашае мінуўшчыны. **Беларусь была толькі гноем дзеля чужое культуры, расейска-польскай.** Усё нашае няшчасьце ў тым, што мы ня мелі свае інтэлігенцыі, якая і зьяўляецца галоўным стварэньнікам і нашэльнікам культуры. Калі былі мы вольныя, ўваходзячы ў склад беларуска - літоўскага княства, тады мы стаялі ў культурных адносінах ня ніжэй за нашых суседзяў. Але як Польшча заняла Літву і Беларусь, то ўвесь так званы служылы кляс, інтэлігенцыя павінна была ці пакінуць Беларусь, адрачыся ад свайго народу і пайці ў Маскоўшчыну, ці застаўшыся, адрачыся ад свайго нацыянальнага выгляду, абпалячыцца і працаваць на карысьць польскае культуры. Простаму-ж, працоўному народу, дастаўшаму становішча бясправных, безгалосых істот, было не да культуры; яго прымушалі працаваць, як вала, ад яго усё бралі і за яго працу давалі гэтулькі, абы хапіла не памерці з голаду і ня страціць здольнасьці да працы. Калі-ж і знаходзіліся асобныя людзі, якія дахадзілі да тае сьвядомасьці, што і яны таксама людзі, дык яны павінны былі шукаць сабе прытулішча ў Запарожскай Сечы, на Дану, на Волзе... адкуль іхны вольналюбівы голас не даляцаў назад да іх братоў, далей нёсшых свой цяжкі крыж.

Мала ў чым зьмянілася становішча беларускага народа з заваяваньнем Літоўска - Беларускага княства і затым падзела Польшчы Расеяй. Ранейшы польскі служылы кляс зьмяніўся расейскім, але доля беларускага народа падаўнейшаму заставалася ўва ўладзе паноў, якія падаўнейшаму бескантрольна кіравалі яго жыцьцём і сьмерцьцю. К гэтаму часу ўжо пашчэзла вольнае казацтва, затое была 20-25 гадовая служба ў войску, куды паны сплаўлялі непакорны, нежаданы, хаваўшы вялікія надзеі, элемент, як Паўлюка Бахрыма з Крошына, гэтага 14-цёх гадовага народнага беларускага поэта 19 века, адкуль ужо ня было ўзвароту. Ато ў лепшым прыпадку памíралі пад бізунамі і кіямі на панскіх стайнях.

А ў гэты час іх валадары, карыстаючы з дармавое працы сотняў, тысячаў душ бясправных „хлопаў“, маглі вольна разьвіваць сваю культуру.

У абарону беларускага народа хочацца паказаць на адзін прыклад з прыроды. Як вядома, пчаліны рой складаецца з маткі, трутняў і працоўных пчолак. Назначэньне маткі—толькі несьці яйкі. трутняў—займацца баламуцтвам з маткаю і есьці, а працоўных пчолак—здабываць мёд, карміць матку, трутняў і дагледаць зьнесеныя яйкі, з якіх потым выходзяць пчолы, словам падзержываць усё жыцьцё ў вульлі. Матка кладзець аднакавыя яйкі ўва ўсіх клетках. А затым ужо самі працаўніцы адну з клетак, з якой павінна выйці будучая матка, расшыраюць удвойчы, утройчы, калі раўнаваць са звычайнымі, лепей кормяць, болей дагледаюць, і такім чынам выходзіць матка. Праз недагляд работнікаў такім-жа чынам выходзяць і трутні. Гэты прыклад ясен, здаецца, без тлумачэньня.

Рэформа Аляксандра II дала сялянскаму народу, у тым ліку і беларусам, некаторую грамадзянска-палітычную волю, але экономічна падаўнейшаму пакінула закабаленымі ў паноў. Гэты важны гістарычны акт, даткнуўшыся ўсяго расейскага сялянства, моцна скрануўшы разьвіцьце расейскае культуры, ня мог пайці на карысьць беларускае культуры, як гэткай, дзякуючы таму, што ўсё болей здольнае з беларускага народа, вучыўшыся, за адсутнасьцю сваіх на роднай мове, у расейскіх школах, адхадзілі потым ад свайго народа і працавалі, такім

Як Лявон хадзіў на пошту.*)

(Адрывак.)

— Як жа, як жа, — гаманіў па дарозе лясьнік, — калі Марыська ўчыцца толькі пачынала, яшчэ й старая мая ногі цягала, меў тады свае лясьнікоўства недалёчка ад вашай вёскі і з бацькам вашым добра знаўся. Заходзьце на ўзароце квасу напіцца, пагамонім, і мая Марыся рада будзе знаёмству з адукаваным чалавекам, будзьце ж, панок, ласкавы. А я швэндаюсь па лесе, пільную кві:ковых баб, каб яя дужа ламалі.

Лявон падзякаваў, падэкляраваў зайці, бо трэба-ж і квіты з пошты занесьці, і шпарчэй засягаў з лесу, каб ня вельмі спозьніцца, бо ўжо пеўна было гадзін восем. Яго гадзіньнік быў у паправе ў мясьцечку, а ў лясьніка спытацца аб часе пасьцясьняўся,—можа ён ня мае гадзініка.

Выйшаўшы з лесу, увесь астатні кавалак дарогі да мясьцечка, па „бальшаку“, пад прысадамі з рэдкіх, старых і пакалечаных бяроз, думаў Лявон аб сваіх новых знаёмых. Было ясна: радаваўся. Толькі ня мог даравать сабе прыкрай, блазенскай, дурацкай той думкі: „Можа гэтая і будзе мая жонка“.— „Што думка жартаўлівая, я выдумаў, каб абязьвініць сябе, а што містычная, то проста дурата,—дурацкая, проста дурацкая думка,—караў ён сябе спосабам, падобным, аднак жа да той думкі. А караў затое, што гэта-ж была зьнявага для тае, каторую ня можа вырваць з свайго сэрца, для тае, каторую пакінуў, каб зрабіці самаўбіуства.

— Са-ма-ўбіў-ства! га-га-га! і-і-гага!—страшэнна зарагатаў Лявон, аж сам спужаўся свайго дзікога голасу і свайго дурнога выбрыку. Маладыя гандляры, што ехалі ня дужа блізка, але і недалёка сьпераду, скрозь гук колаў пачулі яго конскае іржаньне. Той, што сядзеў на каленках бліжэй да хваста і паганяў варaную кабылу хлабасьціваю з усохшае бярозы, закруціў галаву назад і спытаўся ў таго, што ляжаў, абапершыся на саламяны кулю, спусьціўшы ногі за лучок: „Цуес?“ Спытаны адсунуў шапку з воч вышэй на віхрасты лоб, нічога не сказаў і глядзеў назад на дарозе на мужыцкага хлапца, які—невядома: дурэець, ад вялікага розуму, ці дражніцца з імі.

— І-га..! — абарваў свой новы прыпадак рогату Лявон, бо з сорамам—заўважыў, што ў канаўцы, за кустом за адзін мах каменя абуваюцца дзеўкі перад уваходам у мясьцечка. — „Скачы, браце, ў роднай хаце, хто там забароне“—вершам, здаецца, Петрашкевіча выбачаў сабе Лявон.

— Пужаець, як слова мы ня відзім,—сказала адна дзяўчына, засьмяялася і адвярнулася.

— Не чапайся з гэтым! — ціха запярэчылі яе карагодчыцы і таксама пасьміхнуліся.

— Чаму гэта „з гэтым“?—ня ўцерпіў Лявон.

— Бо, відаць, сярдзіты...

— Наета! каб цябе... — запярэчыла колькі галасоў і зноў і усе разам цяпер зарагаталі. Але ён абмінуў іх і ўвайшоў на месьцячковую вуліцу.

Паны і багатыя крамнікі найболей яшчэ спалі. Вакеньніцы ў лепшых дамох, з высокімі ганкамі і бляшанай, фарбаванай і толькі часам гонтавай страхой, былі зачынены. Ля бальніцы стаялі мужыцкія калёсы з падвязанымі ўгору аглоблямі, стаялі з мордамі над травою коні. Сядзелі усякія небаракі, бабы з дзяцьмі, сьляпы дзед з завязаным вокам, а нейкая хворая ляжала на калёсах у бурай кажурыне, быццам ня ўлетку. Ля воласьці таксама ўжо боўтаўся і пачынаў галдзець розны народ. Найболей, аднача, шавялілі прыбраныя людзі да царквы. Ля крамак быў рух і навет даволі бойкі ўжо ля Мэндаля, хоць шмат крам было яшчэ зачынена.

— Куханы! куханы! смасныя куханы!—спакушала Лявова перакупка.

— Што купляес? гэй, ты, хлопец? — запрашала другая.

Кірмашовы стражнік важна, як вялікі індык, хадзіў тут, залажыўшы рукі за сьпіну.

З мэндалевай крамы сыпнуў грудам народ, выскачыла нізенькая, грубая баба у лапцях і з замасьляным, запэцканым вузелчыкам у руцэ, зьбялелая са страху і ад прыкрасьці, а сьледам Мэндаль, даўгі, як жэрдка, рыжы гандляр, з селядцом, і плесь! яе па твару.

— Зладзейка, зладзейка!

— А, людцы, а, родныя! каб-жа я крала...—пяцілася ад яго баба, а ён перахапіў селядцовы хвост у другую руку ды яшчэ раз, ды яшчэ, па твару—плесь! плесь!

Калі селядцовая галава адляцела, тады Мэндаль адступіўся і спакойна пабег да свайго тавару.

Баба схавалася ад гвалту, ад людзей скарэй за сьценку і абцірала рукою белы, як крэйда, з чырвонымі, у селядцовым расоле паскамі, з прыліпшымі луcкамі няпрыгожы, шырокі твар. Да яе надступіўся толькі адзін мужык, бедны таксама, у дзіравым жупане і лапцёх, і яна казала, шукаючы спачуцьця:

— Брахнінька! каб жа я крала...

Мужык пыхкаў піпкаю, нічога не казаў, глядзеў спакойным! вачыма, але ж быў побач.

— Што за шум, а дракі нет? — з жартам узыйшоў на прыклетак мэндалевае крамы стражнік.

— Будзе сытая і так, гаспадзін стразьнік!—вясёла сустрэў крамнік паліцыянта і расчыніў яму свой партабак з дзешавымі папіросамі.

— Чаму ня будзе, го, го!—засьмяяліся сяляне, паўсёдныя „свае“ купцы ў Мэндаля.

— Ай, сто там, не цапайце ўзо яе,—уступілася тая, што прадавала куханы.

Толькі гэта і пачуў і навідзіў Лявон, падыйшоўшы да пошты. І сам быў белы, і ціскаў сэрца, каб ня білася так дужа. Ашаламеў троху, і ня ведаў, чаму так, бяз нічога, прайшоў міма.

Асьцярожна пераступіў цераз маладзіцу з дзіцёнкам, што расьселася на прыступачках паштовага ганка, прайшоў па калідорчыку і ачынуўся ў цёмнай пачакальні. Глядзіць: стаіць канапа, а на ёй сядзяць тры бабы. Адна з пісьмом, а дзьве з пасылкамі. Процяг канапы—дзьверы ў „тэлеграфіцкую“, а трошку водаль—у „касірскую“. У кожных дзьвярох па вакенцу. Ні ў тэлеграфіцкай, ні ў касірскай нікога ня было. Лявон пастаяў, пастаяў, падзівіўся праз вакенцы, што на гадзіньніку ўжо 8 з палав., і прысеў на канапцы. Сядзеў, здавалася даволі доўга.

— Мае роднелькія, калі-ж гэта прыёмка пачнецца? — нахінулася баба з пісьмом да баб з пасылкамі.

— А ці нам ведаць, калі панічкі прыйдуць? — адказала адна, і зноў увесь пакой доўга маўчаў.

Лявон сагнуўся, каб дастаць вокам скрозь вакенца цыферблят і ўвідзіў 8¾.

— Колькі, братка, набаўтала? — з наіўнай простасьцю спыталася ў яго баба з пісьмом.

— Бяз чверці дзевяць.

— Во, што то, значыцца, навука, а мы, цёмныя, нічога не разумеем, як яно тама чыкаець?—і засьмяялася пясьмела, шчыра, і бядуючы над сабою, але больш дзеля гадзіся, бо так усе кажуць.

— Ня была-б то грамата, — падзержыла другая.

— Ведама,—дадала сонная трэцяя.

— „Чаго - ж, самдзеле, піхто ня прыходзіць?“—пачуў крыкрасьць Лявон, і ў той-жа час ў тэлеграфіцкай паказаўся малады, бязвусы чалавак. Бабы ўзьняліся. Адчынілася другое вакенца, пры якім стаяў стол з паперамі, і паштавік сказаў гусьценькім, сыценькім, ужо троху панскім голасам і папанску:

— Гаспада, прашу!

Першая пайшла к вакну баба з пісьмом.

— Панічочак, напішыце вы мне адрэс,—ціхенька прагаварыла баба і памкнулася пакласьці пісьмо на вакенца, але паштавік крутнуўся ў бок:

— Я не абязан пісаць вам адраса!

Баба не спадзяваўшыся на тое, адыйшла.

Тады пацягнулася к вакну другая з пасылкаю. Паштавік узяў пасылку ў рукі, падзяржаў яе і крутнуўся к прасіцельцы:

— А што пасылаецца?

Баба нахінулася бліжэй і сарамліва прызналася:

— Ведама, што, панічок: табака, паперка, пісьмо, сернікі і... гэта, і...

— Што „і“?

— І сала,—адважылася баба,

— А што там за сернікі?

— Сьпічкі,—паясьніла прасіцелька.

— Как?! Пасылаць узрывчатыя ве-

*) Гл. № 7.

чынам, на карысьць расейскае культуры, складаючы ў ёй сваю лепту (афяру).

У тым і хаваецца ўвесь трагізм мінуўшчыны беларускага народа.

Хто хоча пачуць усю праўду аб беларускай культуры, хай паслухае песьню беларускае жанчыны, жняі, бясконцую, цягучую, панурую, без слоў, дапраўды ня песьню, а стогн змучанае душы, у якой, як у люстры адбіваецца ўся безадхланная, беспрасьветная мінуўшчына беларускага народа.

Што-ж пасьля гэтага можна сказаць ў абарону беларускае культуры?

Ш.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсітэт.

Пад такім назовам зьмешчан у № 32 ад 9 лютага 1921 г. менскай бальшавіцкай газэты „Звезда“ вялікі артыкул у форме корэспондэнцыі з Масквы, а куль і чэрпаем колькі вестак, цікаўных для ўсяго беларускага грамадзянства, з даўных часоў хаваючага заветную думку аб сваім унівэрсітэце.

Камісія прафэсароў, запрошаных да арганізацыі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсітэта, вярнуўшыся з свае падарожы ў Менск, падала Камісарыяту Народнае Прасьветы свае арганізацыйныя памеркаваньні, выпрацаваныя ёю супольна з менскай арганізацыйнай па стварэньню унівэрсітэта камісіяй і абформленыя па ўзвароце ў Маскву.

Ня будзем пераказываць гэтага праекту са слоў „Звезды“, бо яшчэ да афіцыяльнага разгляду яго ў Кам. Нар. Прасьв. ў гутарцы прафэсара М. Н. Пакроўскага, заступніка камісара прасьвеветы, з видомым беларускім дзеячам Ф. Туруком высьніўся пункт пагляду Кам. Нар. Прасьв. на кіраўнічы орган ў справе арганізацыі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсітэта. Прафэсар Пакроўскі знайшоў праект маскоўскай камісіі прафэсароў арганізацыйна вельмі громаздкім, які можа зацягнуць арганізацыю унівэрсітэта на час 2-3 гадоў, як ён сказаў. Прафэсар катэгарычна высказаўся за стварэньне „тройкі“, якая здолее рабіць шыбка і энэргічна, а зпашчы дзеля таго, што колегіальнае кіраўніцтва арганізацыяй, навет навуковай часьцінаю (падбор, напр., прафэсарскіх сілаў) цяпер Кам. Нар. Прасьв. не практыкуецца. Кандыдатамі ў кіраўнічую тройку называюць грам. Турука і праф. Пічэта. Найболей жаданым трэцім кандыдатам, піша „Звезда“, усім хацелася-бы відзець М. Н. Пакроўскага, як выдатную навуковую сілу. Праўда прафэсар М. Н. Пакроўскі надта змораны, але тое, што ён быў увесь час нязвычайна ўважліў к арганізацыі беларускага ўнівэрсітэта, даець беларусам надзею, што ўдасца мець яго згоду стаць на чале арганізацыйнае тройкі.

Унівэрсітэты ў Савецкай Федэрацыі напярэдадні сваей новай рэформы, па якой за імі астаюцца толькі факультэты чыста прыкладовага навуковага значаньня (медыцынскі, агранамічні і г. д.), а ўсе-ж іншыя навуковыя дысцыпліны, зьвязаныя з выкладаньнем навук у школах 2-й ступені, ствараюць так званы педагогічны інстытут пры унівэрсітэце (гісторыка-філёлёгічны факультэт, матэматычны і г. д.). Затым мае быць і перапрацоўка вучобных плянаў, бо факультэты будуць трохгадовыя за выключэньнем медыцынскага. Дзеля падгатаваньня чыста-навуковых сілаў арганізуюцца двухгадовыя „навуковыя інстытуты“ пры ўнівэрсітэтах-жа але ўводзіцца абавязковы практыканцкі стаж дзеля будучых працаўнікоў чыстае навукі, што зробіць іх меней адарванымі ад жыцьця навуковымі рабачаямі.

Якраз гэтак трапляе „тройцы“ перапрацаваць увесь праект аб Беларускім Дзяржаўным Унівэрсітэце і рабіць тым самым інакш і ўсю арганізацыю яго.

Паставілі на чаргу пытаньне аб стварэньні канцэлярыі унівэрсітэта, бо ў бліжэйшым-жа часе прыдзецца заняцца фармаваньнем факультэцкіх (вузка спэцыяльных) і агульна-унівэрсітэцкай бібліатэк, надборам навуковых калекцыяў, патрэбнага інструмэнтальнага абарудаваньня лабараторый і др. ўспамагаўчых навукова-практычных кабінэтаў і іншых установаў арганізаванага ўнівэрсітэта. Ужо і цяпер адсутнасьць азначанага месцазнахаджэньня арганізацыйнае камісіі утрудняець дзеля прыхілёных сіл работу, тымчасам шмат ужо зараз можа быць узята ад скасаваньня колькіх эвакуаваных з Беларусі вучобных устаноў, гдзе былі і бібліатэкі і навуковыя кабінэты.

У заключэньне належыцца раказаць, гаворыць „Звезда“, на своечасовасьць пастаноўкі на чаргу пытаньня аб зьліцьці з Унівэрсітэтам менскага політэхнікума і педагогічнага інстытуту. Трэба эканоміць, разважае газэта, навуковыя сілы і тэхнічныя сродкі Савецкае Рэспублікі ды, урэшце, толькі гэтае аб‘ядваньне трох цяпер самастойных вышэйшых вучобных установ і дазволіць паставіць на належнай высачыне навуковае выкладаньне. Новая структура савецкіх унівэрсітэтаў зусім дазваляе гэта выпаўніць арганізацыйна: трэба будзе толькі арганізаваць ў унівэрсітэце некалькі чыста прыкладовага навуковага значаньня факультэтаў і аддзяленьняў, якія спраектаваны ў менскім політэхнікуме.

Менскай унівэрсітэцкай камісіі пара-б ужо заняцца, падказуе аўтор разгляданага артыкулу, нейкі І. С.—зьбіраньнем надта і надта многіх бібліатэк, якія ў свой час былі рэквізаваны ў беларускіх паноў, а таксама паклапаціць пачатак прыйманьню самахотных афяр кнігамі і вучобнымі падмогамі, а таксама фармаваньнем навуковых колекцыяў па этнографіі, экономіцы, сельскай гаспадарцы і прыродным навуковым варункам тэрыторыі Савецкай Беларускай Рэспублікі.

Смачны жабе гарэх, ды зубоў Бог ня даў.

Пасьля таго, як надзей на беспасрэднае ці пасрэднае, праз Сойм, далучэньне Віленшчыны да Польшчы рухнула і на чаргу дня стала пытаньне аб плебісцыту, пры чым ня выключана, што апошні захопіць тэрыторыі, уступленыя бальшавікамі ня толькі Ліцьве, а і Польшчы, г.-ё. чыста беларускія тэрыторыі Горадзеншчыны, Віленшчыны і Меншчыны,—у мясцовых эндэкаў „забурчэла ў жываце“. На шпальтах „Rzeczypospolitej“ і „Gazety Wilenskej“ загаварылі, хто аб „дражлівай квэсьціі“, г.-ё. усё аб тых-жа усходніх граніцах Польшчы, хто—аб высокай польскай культуры і поўнай адсутнасьці, культуры беларускай і літоўскай, ergo—беспадставнасьці ідэі літоўскай і беларускай дзяржаўнасьці. „Ці магла б культура беларуская аб літоўская заступіць культуру польскую?“ пытаецца І. О. з „Rzeczypospolitej“, і адказвае: „Чаму не? Толькі раней належала-б стварыць гэтыя культуры, каторых няма абсолютна. Калі Літва ці Беларусь высунуць свайго Шэкспіра, Расіна, Гётэ, Міцкевіча і іншых, тады атрымаюць належнае месца ў сям‘і культурных народаў“, а да той пары і Літва і Беларусь, разумецца, павінны быць залежнымі ад Польшчы. За адно з беларускай і літоўскай радзім п. І. О. спасаваць незалежнасьць усіх тых, хто не дачакаўся яшчэ, дзякуючы гвалтам і ўціску над імі дужэйшых, сваіх Шэкспіраў, як напрыклад Баўгараў, Сэрбаў, Украінцаў, Грузінаў, Армянаў і амаль ня усіх так званых малых народаў.

Мы добра ведаем, для чаго пан І. О. разьвівае сваю „тэорыю“. Сабака закапана у польска-эндэцкіх прэтэнзіях на так званыя „Усходнія Крэсы“, г.-ё. на Літву і Беларусь, справа каторых станавіцца на нежаданы для п. п. І. О. грунт „дражлівай квэсьціі“ аб каторай нейкісь анонім „Т. С.“ у „Gazece Wilenskej“ піша так:

„Віленская справа ёсьць дражлівая ува ўнутраных стасунках Польшчы“, бо адна частка Польскага грамадзянства стаіць за «далучэньне», а другая — за фэдэрацыю. Аднак, ніводная з гэтых концэпцыяў „не адпавядае поглядам Антанты“. З гэтай прычыны „Віленская справа і навет цэлая справа усходніх граніц Польшчы ёсьць „справа дражлівая“ паміж Антантай і намі (Польшчай)“.

І далей пан Т. С прызнае, што „Англія і Францыя у грунце справы уважалі і уважаюць, што адзінай па

шчаства! Да я нікагда гэтава пе дазволю. Прашу пусьціць другіх.

Адсунулася і яна, забраўшы сваю пасылку.

Якраз увайшоў у касірскую паштмэйстар, даволі высокі чарнабароды чалавек. Сеў у сваім пакойчыку на стулік і маўкліва заняўся выйманьнем розных папер з столу. Тады і Лявон стануў ля ваконца, паклаў пасыланыя пісьмы, ёй, і тое лясьніковае, і чакаў. На пошце прабіла дзевяць гадзін.—„Уга,—падумаў Лявон,—гэта-ж начальнік пошты спазьніўся аж на цэлую гадзіну,“ — падумаў і глядзеў, чакаючы.

— Ізвініце (выбачайце)! — сказаў адзаду нейкі круглы пан і праціснуўся ў дзьверы касірскай. Начальнік пошты ўстаў, прывітаўся з панам і падсунуў яму крэсла. Гэта быў месьцячковы доктар. Зараз у іх пачалася ажыўленая панская (расейская) гутарка.

Бабы слухалі, хоць не разьбіралі, і заглядаліся на іх, стоячы за Лявонам, адылі адна шэпчаць другой: „Ну, рыбулька, прыдзецца мне пайці не паслаўшы“...

Лявон чуў і чакаў моўчкі. Паштавік пасьпеў напісаць, што трэба для заказных пісьмаў і падаў квітацыйную кнігу, хто яго ведае, навошта—начальніку. Доктар гаманіў а гаманіў, начальнік слухаў і часам нешта сам казаў. — „Во зюкаюць“...—сказала адна.—„Бо ведама-ж — паны“, — адказала другая. У прыёмную прыйшло яшчэ колькі сялян.

— Панічок, во мая пасылка і во за перасылку і за вашую турбацыю рублёк грошы,—падсунулася нейкая новая маладзіца.

Паштавік пачырванеў троху, што чутна сказала, а ўзяў і стаў пісаць.

— Перасылка вам каштуе восемдзесят капеяк—прывёў ён справу ў яснасьць, бо дваццаць капеяк „гасьцінца“ ня бог ведае, што за пацеха.

— Дайце квітанцыю! — зьвярнуўся Лявон да паштмэйстара, голасна, каб ён пачуў.

Той маўчыць і слухае доктара, а доктар гаворыць, аж пыхціць і брызкаецца, толькі лоб хвустачкаю цярэць. Тымчасам прыбягаець яшчэ паненка, ува ўсім чыста чорным і сама чорная, як той жучок. Паштавік паслушна скораньках адчыніў ёй забаронныя дзьверы, і яна пыхнула ў касірскую.

— Ці ня можна паслаць грошы? — панскім голасам і папанску (парасейску) запыталася яна, прыемна вітаючыся з доктарам і начальнікам пошты.

— Чаму ж ня можна, а зпашча для паненкі,—жартам адказаў начальнік і папярэдліва пасадзіў чорную на стул. Лявон цярпліва адыйшоў ад ваконца і сеў на канапцы. На эрцы ж у яго кіпела, і мімаволі складываліся словы і сказы таго, што захацелася напісаць аб пошце у друк. Рэдакцыі мяняліся, ахвота скрытыкаваць паштавікоў у газэце то раптам прападала, то зноў пякла яму сэрца. Ад пошты яго думкі пераляталі на ўсё жыцьцё, зьяўляліся вобразы, зьяўлялася мімавольная, механічна-мазгавая творчасьць як у васьне, якая патроху пераходзіла ў творчасьць сьвядомую, здавальняючую. Лявон мысьлена пісаў на паперы назоў свайму твору, выбіраючы лепшае слова: рабы, хамы, падлягані нікі...

І тварыў, і тварыў (навет мог бы імправізаваць у голас).

„Ідзець ён, прыгнуўшыся, туляючысь. У белай старой сярмязе, у стоптаных лапцёх. Ідзець—баіцца. Па тратуару ён ня йдзець, каб не запэцкаць каго з іх, у чыстым, у чорным, у панскім. Каб сваім убогім хатыльком не таўхануць каго з іх, далікатных і непадступных, ды й насьмешлівых. Ен месіць балота збоку вуліцы, шчэміцца наўкол дрэўцаў, што ля тратуару, а йдзець, пэўне, ў уезны (паветавы) зьезд. Можа, на суд? Можа яго судзяць за што? Ен тужліва і сьмешна скідаець шапку перад гарадавым. І перад усякім бліскучым гузікам і какардаю. Скідаець перад „імі“. Усё роўна — „яны“. Ці „ён“—судзьдзя, ці — пан вялікі, ці—начальнік які. Можа — воінскі, можа — земскі, можа прыстаў станавы. Хто падзівуецца, а хто й не ўважае з ні званьня на яго мужыцкую, на яго дурную прывычку здароўкацца ў горадзе. А другі з радыкальных паноў падумае з грамадзянскай засмучонасьцю: „Гэта ня ветлівасьць. Гэта рабства, ня йначай“. А той, аб кім пан гэтак думае, а той „хамуйла“ абмінець пана, як скулу, дасьць дарогу і зірнець з-пад лоба, з-пад нізу, як з-пад якога падыспадзьдзя. Як чакаючы ўдара пад палкаю. Плюскаючы вачмі, як быццам паб'юць яго. Драўляныя самадзялковыя гузікі ў сярмязе. Маргелка. На руцэ вясла лыкаў або бублікаў, калі што прадаў і ня надта пітушчы. Ен тут чужы, гэты чалавек лясоў і балотаў. Папіхайла пнёў, і балот, і гнілых калод. Ен тут у чужым сьвеце. Але яго тут знаюць. Знаюць, што ён ніжэйшы. І ён іх знаець. Ведае, што яны зробяць з ім усё, што захочуць. І ведае, што яго лічаць за нешта ніжэйшае. І ведае, што адылі ён такі самы, толькі бедны й цёмны, і дзеля таго так пагпядае, як бы баючыся, што далўць па галаве кіём. Як пабіты сабака. Як пакрыўджанае дзіцянё. Як воўк у клетцы. Як конь, што пугаю па саменькіх вочах яго насьцябалі. Як усе яны разам, выглядаючы аднымі вачыма, у каторых ёсьць тое усё, усё разам. Як тая нягрыцянка з дзіцёначкам на ўлоньні, што на малюнку у кніжцы „Халупка дзядзькі Тома“. Больна. Шчэмка, зьніблїва. Войстрае пачуцьцё распутай людзкасьці. Пякучае пачуцьцё крыўды. Ай, каб ішоў ён горды, вартны, паважны. Моцны духам. І багаты. І чыста апрануты. Адылі... Дух жа ў яго спакойны. Гдзесьці на сподзе яго душы ёсьць гордасьць, што ён гэткі. Гардзіцца тым, што ён і гэткі жыве. Іменна гэткі, скрыўджаны. Дурань сьвяты! ігага-га-га!! — зарагатаў мысьлена Лявон так, як рагатаў на „бальшаку“, на вольным паветры у голас, а ня мысьлена. Дурні сьвятыя, іга-га!!

Працёк час.

Ідзець ён па тратуару, у ботах і ў шэрай, пінжаком шытай адзежыне. З двума радкамі, даўгімі двума радамі шэранькіх гузікаў, купленых у краме. І ў казыру маскоўскім — таксама з крамы. Адным словам, — шляхціц. Пасэсару нос падатрэць. І ня дужа каму абходзіць дарогу. А бяднейшых наўмысьля не заўважаець, бо і яны — рабы, але ўжо і за яго ніжэйшыя. Сустракаючы паважнейшых, тоўстых з какардамі і гузікамі для адзнакі ад горшых, стрэўшы гэткіх скідаець, гад, шапку, перастае лушчыць семячкі і на адзіх мах (міг) глядзіць як нягрыцянка. Ня тое што — глядзіць, а нешта мігкаець у яго такое у вачох, толькі зараз хаваецца, і ўжо даволі доўга хаваецца. Ен багатыр: замест скрыўджанай дзядоўскай гордасьці, той мізэрнай дурнасьвятасьці, важыў гордасьць крыўдзіцеля, самалюбаваньне, хоць і рабскае, але вышэйшае, ага!

Працёк час.

Ідзець ён у чорным пальце, што носяць паны, і ў брылю, і ў штанох „навуліцу“ (навыпуск), ёчкам махіль, махіль! і ня відзіць таго свайго родзіча, што ў белай сярмязе і ў маргелцы і з вяслам бублікаў ці лыкаў бмінаець яго асьцярожненька, з тратуару далёка сыступаець. Дыміць папіроскаю і гэтак важна йдзець, што кожны сам дарогу даець. А з агідаю моршчыцца, калі другі яго родзіч, той у шэрай пінжаком шытай адзежыне, паліч(?) шы, відзіць за „жыдка“ яго, валіць проста, хам, плячом на яго і кідаець сваёю сьлюнявою шалупашкаю, шалухою ад сланешніка, сваім хамскім семячкам проста яму на бліскучыя боцікі. І толькі на выгляд з такою агідаю паморшчыўся, а на сподзе душы баіцца, каб яго не абразілі, як простага, не сказалі-б яму крыўды, як жыдку ці гэткіх слоў, як роўнаму: „Слухайце! Гэта ня вы, панічок, Ярмолін сынок, дзядзькі Ярмолы, га? Каб так ня спыталіся, баіцца ён тут, а зазвычай баіцца, як нячысьцік ладану, каб не зьляцець з таго панства свайго, каб зноў не зраўнавацца з тымі рабамі, за якіх вышэй цяпер. Баіцца, гад, каб ня страціць той мажлівасьці любавацца сабою, як вышэйшым за іх. Таму вось так, ня з поглядам сабакі пабітага, дарма пакрыўджанага, а з выглядам падласага ды подлага сабакі скідае брыль перад рабом, яшчэ вышэйшым за яго. Дык навошта жадалі яму заместа сярмягі—пальто, заместа маргелкі—брыль, заместа лыкавага вясла—кіёчак або стэк, навошта, калі яны нішчаць у яго навет гордасьць затуканага? А чаму ж і не? Ці ж ня лепей горды хам за сьвятога папіхайлы-раба?“

Імпровізацыя лявонава з парадку стройнага зьбілася, думкі для самога сталіся няяснымі, і ён к ваконцу, збоку чарады, ізноў падыйшоў. А паны гамоняць а гамоняць, гамоняць а гамоняць,— доктар рохкае, паненка—чорны жучок— ад падсьвісту захлібаецца, начальнік кiвaець галавою барадатаю і часам зьлёгку падрагатываець, аж паштавік, што ля

сутнасьці правільнай граніцай Польшчы ёсьць вядомая лінія Кэрзона", а што на усход ад яе, то „Польшча ўласьціва не павінна мець нічога да гаварэньня аб тым".

Як бачыце, польска-эндэцкія справы стаяць зусім дрэнна!

Т. С. далей прызнаецца, што „аж да хвілі, покуль не адродзіцца Расея", „справа узнаньня нашых (польскіх) правоў на польскія (чытай: літоўска-беларускія) абшары ёсьць правізарычнай" навет з боку Францыі, каторая „на выпадак польска-расейскага конфлікту мусіла-б забясьпечыць сабе вольнасьць дзеяньня".

Навет, Францыя, і тая проціў. „А што Англія скажа па гэтаму пытаньню, яшчэ ня ведама".

Так горкімі сьлязьмі аблівяюцца эндэцкія анонімы І. О. і Т. С. пасьля грунтоўнага правалу усіх іх надзей на беспасрэднае ці пасрэднае праз Віленскі Сойм далучэньне да Польшчы літоўска-беларускіх тэрыторый. Шкада нам Вас, паны, што Вы зубы ламаеце аб нас дарма, што няма у нас Шэкспіраў, і паламаеце, як зламала ужо аб нас свае мацнейшыя за Вашы зубы царская Расея.

Міхновіч

Беларускае пытаньне.

(Агляд друку).

У № 151 «Виленскаго Слова» зьявіўся артыкул пад назовам «Беларускае пытаньне», у якім аўтор дае кароткі, але ўсебаковы, бесстароньні і правільны абраз нашага сучаснага палітычнага становішча. Аўтор падпісаўся адной літэрай Ш. і зьяўляецца для нас новым і невядомым публіцыстам. А глядзіць на беларускае пытаньне так сур'ёзна, як рэдка хто да гэтага часу глядзеў на яго ў расейскай прэсе. Цяпер, напрыклад, эміграцкія расейскія газэты ня толькі зусім белагвардзейскія, але і маючыя да гэтага часу прэтэнсію на «свободомыслие», старанна маўчаць аб нас і аб нашых дамаганьнях. Маўчаць, ня гледзячы на тое, што ў рэдакцыі амаль ня кожнай з іх, як нам вядома, ёсьць беларусы, разумеецца, рэнегаты (зраднікі свайму народу).

З тым большай прыемнасьцю і ўдзячнасьцю прачытае кожны сьвядомы беларус такія радкі ў вышэйказаным артыкуле:

«...як бы хто на гэтае (белорусское) пытаньне не глядзеў, але павіннасьць кожнага добрага грамадзяніна вымагае голасна абвесьціць, што тыя высокія ідэалы волі, роўнасьці, самавызначэньня нацый, якія выйшлі з мора крыві, сьлёз і мучэньняў нарсдаў за час мінулае вайны, не павінны так груба таптацца нагамі! А Беларусь, аджэ, болей за ўсё склала афяр ва імя гэтых ідэалаў.

Колькі ў сваім часе выклікалі спачуцьця за свае мучэньні ад вайны Бельгія і Сэрбія. А чаго варты іхныя афяры, раўнуючы з афярамі Беларусі? Тады, як тыя былі толькі адзін раз акупаваны немцамі і цяпер ужо трэці год маюць спакой і карыстаюцца матэр'яльнаю дапамогаю з усіх бакоў, Беларусь перабывае шостую акупацыю, у часе якіх кожная старана, прыходзячы і затым уступаючы месца іншай, усё аддавала на рабунак, пад меч і вагонь.

Ды гэтым яшчэ ня скончыўся ўвесь трагізм Беларусі. Калі пачаліся рыскія перагаворы, якія дзеля Беларусі ёсьць ня чым іншым, як торгам з-за 30 срэбранікаў, дык дзеля беларускіх прадстаўнікоў навет не хапіла месца за агульным столам, ня гледзячы на тое, што ўвесь бо сыр-бор, уласьціва кажучы, і загарэўся з-за іх. Пасьля гэтага усім шчырым беларусам, якія змагаюцца за свае нацыянальна-дэмакратычныя правы, праясьнела, што ад гэтага замірэньня ім чакаць няма чаго, што гэткім шляхам мэты не дасягнеш.»

Зрабіўшы пасьля гэтага належную ацэнку дзеяльнасьці Вацлава Ластоўскага, які «моцна дзяржыць у сваіх руках штандар незалежнае Беларусі», аўтор артыкулу справядліва кажа, што Ластоўскі разгарнуў перад грамадзкай думкай Заходняе Эўропы пялёнку, хаваўшую беларускае пытаньне, але што роль Лігі Народаў у гэтай справе няма што высака ставіць, бо яна сама—няўдачны скідыш мінулае крывавае вайны, ад якой выракся сам тварэц яе Вільсон. Аўтор піша:

„Гаразд вялікшае значаньне мае-ць тое моральнае ўражаньне, якое зрабіў Ластоўскі сваім раскрыцьцем беларускага пытаньня перад грамадзкай думкай Заходняе Эўропы і той гістарычны акт, які быў ім падпісаны ў Коўні з Літвою, на моцы якога абодва брацкія народы урачыста абяцаліся дапамагаць адзін аднаму ўсімі спасабамі ў змаганьні за сваё незалежнае існаваньне".

Малюючы сумнае жыцьцё Беларусі, аўтор надта добра схапіў і паказуе галоўныя асаблівасьці яго на ўсходзе і заходзе:

„А пакуль што Беларусь акупавана і падзелена на дзьве часткі. І ў той час, як ў адной частцы хоць і ўсё ад яе бяруць, але ў той-жа час і шмат чаго даюць, бяруць матар'яльнае, а даюць духоўнае: адчыняюць ніжэйшыя, сярэднія і вышэйшыя беларускія вучобныя ўстановы (ў адных Менскім павеце, ня лічачы м. Менска, адчынена болей за 100 ніжэйшых беларускіх школ), падсабляецца і ўводзіцца ў жыцьцё беларуская мова, вядзецца ў шырокім масштабе культурна-асьветная дзеяльнасьць сярод беларусаў і г. д., у другой яе палавіне бяруць ня меней, але даюць назад дужа мала, калі не сказаць болей, г.-ё. што навет адбіраюць тое, што было дадзена раней: зачынен нацыянальны беларускі камітэт у Горадні, інспэктары адмаўляюцца выплачываць пэнсію беларускім вучыцялём, арыштоўваюцца масамі беларускія культурна-асьветныя дзеячы, зачыняюцца газэты,—словам творыцца тое, што не магло ня выклікаць голаса пратэсту навет збоку польскіх социялістаў ў Варшаўскім Сойме."

Урэшце, як вывад, аўтор кажа тое, што пастараемся прыняць напавер,—ён прызнае:

„І мы відзім, што польскі урад пачаў праканавываца ў тым, што беларускае пытаньне ня можна так безцэрамонна адкідаць, што ў Беларусі нельга ў наш час сярод белага дня і на вачох усяго культурнага сьвету тварыць тое, што тварылася ў афрыканскіх калёніях сярод чорнаскурых..."

▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪

Брату—вучыцелю.

Сей, браце мой мілы, сей поўнаю жменяй,
Загон свой гусьцей засявай,
Ціхутка і роўна, ня болей, ня меней,
Ад краю загона у край.
Хай віхры бушуюць, гудуць навальніцы
А ты ні на што не зважай —
А шагам за шагам па сьвежай зямліцы
Упярод ды ўпярод падступай.
Ня бойся, мой брат, не загінуць зярняты,
Што ўкінеш ты вернай рукой,
Як дар яны з неба там будуць прыняты
Даўно ўгатаванай ральлёй.
Задзівішся сам ты, як сонцам прыгрэе,
Што стане з тваёй пасады,
Як буйна на вочах яна зарунее,
Як хутка ўсплывуць каласы.

Ігнат Дварчанін.

Русалка.

Сонейка гасьне, цені валакуцца,
Снуюць па ўзьбярэжжу вазёрным мрацы,
Русалкі прынадна здалёку сьмяюцца,
Ну-й дзівы-ж бываюць у нас панічы.

А цёпла, а парна: пашоў-бы купацца,
Хоць страшна русалак, вадзяніц, і мокш
Так цудна, так пекна: ці-ж можна стрымацца,
Хто дзеўкі баіцца, куды-ж такі гож!

Нурком я кідаўся у возера тоні,
Плыву па жвірочку, па жоўценькім дне,
А дух замірае... Ужо можа гоні...
Даволі!.. Нясі-ж ты, вадзіца мяне!

Ах, лёгка ўздыхнуці... Раскрыйцеся вочы,
Нябескі Дажбожа! А гэта-ж хто там
Касу расплятае, стан мые дзявочы?..
Ці зданьне, ці што: не згадаю я сам.

вакенца, і той, як свой да сваіх, галаву назад закруціць і ухмыльнецца моўчкі.

— Дайце квітанцыю!—нядобрым голасам сказаў Лявон.

— У нас гатовых квітанцый нет (няма),—ціха і злосьліва паштавік дае адказ і на сваё начальства аглядаецца. А ў Лявона кроў кіпіць, сэрца заміраець і рукі, потныя, дрыжаць, зірнуў ён на гадзіньнік — бяз чверці дзесяць гадзін. Зараз, значыцца, зачыняць пошту. Тут, даў бог, доктар і паненка з паштмэйстрам разьвіталіся, паштавіку, надта занятаму, галавамі паківалі і выйшлі за парог на вольнае паветра. Бабы ўздыхалі і клялі паштовага начальніка, што дзяржыць іх, ліха яго ведае, навошта. — „Другую нядзелю хаджу, а ўсё дарма, і ўсё тут гэты круглы, як чурбан, панок крупіцца, каб і ён з імі з усімі лопнуў, каб яго"... — так пазюкаўшы, пакляўшы, пайшлі і яны за парог на вольнае паветра. Паштмэйстар нешта папісаў, у кнігу паглядзеў, устаў з свайго сядалішча, к вакенцу падыйшоў, вочы падкаціў і, кінуўшы Лявону квітанцыю, гыркануў, як той злосьлівы цюцька:

— Ты не нахальнічай, хлапец! У мяня гатовых квітанцый нет...

Прасіпеў так, аж яго рукі пабялелі і вярнуўся к свайму століку, сьпінаю адвярнуўся.

Прабіла дзесяць гадзін.

— Гаспада, пошта закрыта,—сказаў паштавік і зачыніў абодва вакенцы. Людзі разыходзіліся, хто навет сьмяючыся, а найболей злуючы і навет халяруючы. Выйшаў і паштавічок у пальцечку нараспашку, кінуў панскім вокам на Лявона, што адзін у прыёмнай застаўся, і выскачыў на пагулянку з пісароўнаю—гімназісткаю. Вось урэшце і паштмэйстар лопнуў дзьвярмі касірскага пакою замкнуў і ўвідзіў у прыёмнай аднаго хлапца—бунтоўніка, Лявона. Пытаецца:

— Пачаму ня ўходзіш?

— А во чаму...—зьмянёным, сіпатым голасам ціха адказаў Лявон, раптам адхмахнуўся, і сама рука моцна ўдарыла па шчацэ і па вуху таго. Так у гузічках і заваліўся на канапку. А Лявон, атупеўшы, ня ведаў, што далей рабіць, узяў і пайшоў за парог, на вольнае паветра.

Ніхто не даганяў яго.

— А во чаму...— шаптаў Лявон; — і во чаму...—сьціскаў кулак, успамінаючы, а шпарка йшоў сярод людзей ля крамак, дзе ад торгу быў ужо ня малы гук і пыл.

Максім Гарэцкі.

8/VII 20.

Пуцяводныя ідэі беларускае літэратуры.*)

Мы затрымаліся крыху даўжэй на Багушэвічу, бо ён першы разьвярнуў у сваіх творах гэткую шырокую праграму, паставіўшы сабе галоўнымі мэтамі: прабуджэньне ў мужыка самапашаны, пачуцьця сваей чалавечай і нацыянальнай годнасьці і вартасьці. Бо ён першы абвяшчае самацэннасьць нацыянальнасьці і мовы беларускай. І па гэтай дарозе йдзе доўгі сьцяг яго духовых насьледнікаў (з найбліжэйшым яму па духу Янкам Лучынай),—і ўсе тыя беларускія дзеячы, што паклалі падваліны сучаснага адраджэнчэскага руху, кшталтавалі сваю ідэолёгію на ідэалах і лозунгах Мацея Бурачка. Ен—прадвесьнік таго магутнага нацыянальнага руху, каторага яму прыждаць не давялося, але каторы пераняў і разьвінуў яго духовыя элемэнты і, апіраючыся на іх пайшоў далей—да новых кругазораў.

Як ні добра знае Багушэвіч душу беларускага народу, як ні адчувае ўсе яго беды і гора,—ўсё-ж голас яго гэта яшчэ ня голас самога народу. Багушэвіч—інтэлігент, узрослы і ўзгадаваны ў шляхоцкай сям'і, стаіць яшчэ над народам. Ен будзіць цёмную, забітую, бяспраўную народную масу да новага жыцьця; ён хоча, каб народ сам свой голас даў:

І народ дае гэты голас. Дае яго ў дні ўсенароднага бунту проці старое ўлады маскоўскіх цароў. У рэвалюцыйным катле кіпіць душа беларуса. Агульны размах і гон цягне яго з сабой упярод, а разам з гэтым творыцца новая народная псыхалёгія, кшталтуецца новы сьветагляд і разьвіваюцца запраўды народныя ідэалы, якія беларускі народ выказвае вустамі сваіх лепшых сыноў—песьняроў. У словах гэных песьняроў вычуляецца бунт проці ўсялякага гвалту, чуваць прызыў да барацьбы, магутны кліч: „наперад—па шчасьце!" (Купала). Песьняры рэвалюцыйнае пары (1905-6 г. г.) ужо не навучаюць народу, чаму ён павінен шанаваць і сябе і ўсё сваё. Не: іх голас—гэта крык рабалеўшае душы самога народу—тых сыноў вёскі, якія падняліся сваім талентам на недасьціглую вышыню, і перад іх вачыма раскрыліся новыя, ня бачаныя шырачэнныя кругазоры.

Што-ж яны нам весьцяць?

Іх многа: і Купала, і Колас, і „Цётка" і многа; многа другіх песьняроў часоў першае рэвалюцыі, але мы ня будзем затрымліівацца над кожным з іх асобна, бо ўсе яны йдуць да аднае мэты. Яны паглыбляюць старыя ідэалы Багушэвіча, захопліваюць усё шырэйшыя кругі жыцьця, зачапляюць новыя тэмы. Яны выходзяць з рамак антытэзы: „панства-мужыцтва". У іх і мужык і работнік жывуць сваім асобным самабытным і многабочным жыцьцём, будуюць ідэал будучыны, не зьвяртаючы ўвагі ні на панства, ні на сучасны лад: яны разрываюць усялякую сувязь з старым сьветам. Работнік, мужык і жаўнер падаюць адзін аднаму руку і кідаюць сьвету цьвёрдыя, быццам каваныя із сталі словы: „мы—сіла, мы—права!" («Сон над крывавымі разорамі» Цёткі—„Наша Доля" № 1, 1906). І ўжо няма гутаркі аб вызваленьні з цяжкіх путаў няволі аднаго толькі мужыцкага стану, аб чым думаў Бурачок: маладая рэвалюцыйная поэзія пашырае багушэвічаўскі ідэал на ўсю беларускую нацыю. Выкоўваецца новы—нацыянальны ідэал.

Аб такім нацыянальным ідэале першы пяе напярэдадні рэвалюцыі 1905 году Казімір Кастравіцкі (К. Каганец), і яму рысуюцца абразы мінулае волі і славы беларускага народу („Прамова"— ў „Каляднай Чытанцы" 1903 г.) І калі Якуб Колас усё яшчэ астаецца перш за ўсё песьняром вёскі, зачараваны яе хараством; калі Купала таксама верны сын вёскі беларускай, пачынае скромна ад жаданьня толькі „людзьмі звацца"· калі „Цётка" з матчынай тклівасьцю апявае сваіх „вясковых сястронак",—дык яны сваей творчасьцю абнімаюць і ўсе праявы беларускага нацыянальнага жыцьця, жыцьця беларуса, як такога, незалежна ад яго стану, ад соцыяльнага палажэньня. Далёкая мінуўшчына зьліваецца ў іх з сягоньняшнім днём і працягваецца ў далёкую будучыну. У іх выяўляецца цэльнасьць гістарычнага істнаваньня беларускага народу.

Асабліва ярка вырэзываецца на фоне сучаснай беларускай літэратуры Янка Купала, як нацыянальны прарок у шырокім разуменьні гэтага слова. Сілай свайго таленту ён так жыва, так праўдзіва і так па мастацку малюе поўню нашага нацыянальнага жыцьця ва ўсіх яго мінулых і сучасных праявах. Ен сягае і да пацямнеўшых ужо і зацертых абразоў князёў і вояў старадаўных, і да нявычарпанай крыніцы народнае поэзіі. Багацьце адценкаў перажываньняў і настраеньняў у Купалы—нязвычайнае. У яго асобе найбольш поўна выявіліся ўсе тыя думкі і ідэалы, якія творыць працэс адраджэньня нашага народу.

А. Навіна.

(Працяг будзе).

*) Гл. № 5 „Н. Д.

Хоць з жахам у сэрцы, плыву я ціхенька
Да зьявы вось беленькай-пекненькай той;
Яна-ж, расчасаўшы касулі чарненькі,
Абмыла свой тварык крынічнай вадой...
Пусьцілася плыць у маю, у старонку,
Нурка ізноў даў я адразу на дно,
І думаў, што... пойдзе яна наўдагонку,
Затопіць мяне ў глыбіні ўсё адно.

На верх ізноў выплыў, бо духу ня стала.
О дзівы! Русалка блізенька пры мне:
Туды і сюды ўсё плывала-плывала,
Казаў-бы й не бачыла быццам мяне.
Аж я адгукнуўся: „Русалачка-душка!
Паглянь-жа хоць раз, калі ласка, сюды:
Ня будзь так пужлівай, вадзіцы дачушка,
З табою міленька паплыву хоць куды..."

Ня слухае!.. Дарма!.. На бераг сьпяшае,
Ах, што-ж там?.. Адзеньне яе!!!
Ей сорамна неўта, вось за куст уцякае
Кашульку ў міг на сябе ўзьдзяе.

У хвілінку гатова, на мяне ледзь зірнула,
Неспакойна глянула са-двойчы кругом:
„Ты шалуцька хлапец!" сьмяючыся ўсклікнула,
І пашла пяючы „далінаю—лугом..."

Казімір Сваяк.

Савецкая Беларусь.

(Ад нашага карэспандэнта).

Савецкі пасол у Літоўскай рэспубліцы Аксельрод афіцыяльна сказаў, што маскоўскі ўрад пастанавіў далучыць Смаленшчыну, Віцебшчыну, Магілеўшчыну і наагул усе сумежныя з Маскоўшчынай этнографічныя беларускія землі да Беларускай Савецкай Рэспублікі, абвешчанай беларускім камуністычным урадам у Менску. Беларуская Савецкая Рэспубліка разглядаецца маскоўскім камуністычным урадам, як незалежнае гаспадарства, дабравольна зьвязанае з усёй Савецкай Фэдэрацыяй на роўных дзеля ўсіх часьцін фэдэрацыі правох. Дзяржаўнай мовай ў Савецкай Беларусі прызнаецца беларуская мова з захаваньнем камуністычнага прынцыпа раўнапраўнасьці ўсіх моваў.

Паустаньне у Мсьціслаушчыне.

У Менск прыйшлі весткі, што атаман Сьпірыдонаў, павялічыўшы свае сілы новымі сялянскімі аддзеламі, забраў горад Мсьціслаўль (Магілеўск. губ.) і йдзець на г. Рослаўль (Смаленск. губ.), куды сьцягіваюцца вялікія бальшавіцкія сілы). (Руспрэс).

З Баранавіч паведамляюць, што аддзелы атамана Сьпірыдонава выбіты бальшавікамі з горада Рослаўля. Сьпірыдонаўцы ізноў адступілі ў глыб Магілеўшчыны. (Руспрэс).

Палескае паустаньне.

„Виленскій Курьеръ" (№ 473) паведамляе, што некалькі дзён таму назад паўстанцамі быў зроблен налёт на старанна пільнаваныя бальшавікамі склады знарадаў і узрыўчатага матар'ялу, якія былі ў лесе на ўсход ад вёскі Вялікія Чыжаўцы, за 70 вёрст ад Лунінца. Ручнымі гранатамі была зьнішчана варта, а потым узарваны стаяўшыя на калеі 7 цягнікаў (паяздоў) са знарадамі і вялізазныя склады агнястрэльнага прыпасу. Сталіся выбухі гэткай вялізманай моцы, што лес на некалькі вёрст наўкол паваліўся быццам ад віхору, і навет у далёкім Лунінцу задрыжэлі будынкі і вылецела шкло з вокнаў.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Пятніца, 18 лютага 1921 г.

Лацьвія і Літва. *Рыга*, 16 лютага (Е. Е.). Чакаецца прызнаньне Літвы de jure (па праву) латышскім урадам.

Польшча. *Варшава*, 17 лютага (О). У Сойме цягнуліся далей спрэчкі аб дэкляарацыі Вітаса. Дэпутат Вазьніцкі („Вызваленьне") тлумачыў супраціўны настрой свае партыі тым, што толькі левы ўрад можа даць Польшчы замірэньне і спакойнае разьвіцьце.

Іофэ — пасол у Берліне. Варшава, 17 лютага (О.). Палітычныя колы дасталі ведамасьці, што цяперашні старшыня савецкай міравой дэлегацыі ў Рызе Іофэ будзе назначаны савецкім пасломм у Берлін.

Красін паехау ізноу. Рэвель, 17 лютага (Е. Е.). Красін выехаў з Рэўля ў Лёндын. Ен вязець новыя прапазыцыі ў англа-савецкай гандлёвай умове.

Амэрыка. *Вашынгтон*, 16 лютага (О.). Сэнат Злучаных Штатаў аднагалосна прыняў праект новага закона аб эміграантах. Калі ён будзе прынят конгрэсам, дык лічба эміграантаў у Злуч. Штаты ня будзе перабольшываць 300 тысячаў.

Турцыя. *Лендын*, 16 лютага (О.). Кемаль-паша задумаў стварыць новы анаталійскі ўрад з прынцам Асманам-Фуадам на чале.

Хворасьць Марозава. З Пецярбурга паведамляюць, што ў Яраслаўлі цяжка захварэў вядомы шлісельбуржац Н. А. Марозаў.

Субота, 19 лютага 1921 г.

Лацьвія прызнала Літву.

Польшча. Польскі міністр заграннічных спраў Сапега едзець у Румынію з мэтаю заключыць палітычны і экономічны трактат для стварэньня адзінага фронта на Усходзе Эўропы.

Італія выказываецца за прызнаньне Азэрбейджана.

Турцыя дамагаецца перад хаўруснікамі: 1) захаваньня сувэрэнітэту Турцыі над Дарданеламі і Кастанцінополем, 2) уваходу ў склад паміжнароднага кантролю Злучаных Штатаў, 3) сувэрэнітэту Турцыі у Анатоліі, Сьмірне, Урсе і Індабе, 4) пераходу большай палавіны Фракіі да Турцыі, 5) гарантыі праў мусульманскіх меншасьцяў у адабраных ад Турцыі абласьцях.

— Рэвалюцыйны турэцкі ўрад выдаў дэкрэт аб пераходзе ўсіх каменаломняў на турэцкай тэрыторыі ўва ўласнасьць гаспадарства.

Нядзеля, 20 лютага 1921 г.

Літва. Літоўскі міністр заграничных спраў Пурыцкіс адказаў на пратэст польскага міністра Сапегі проціў канфіскацыі польскіх земляў у Ліцьве, што паведамленьні аб канфіскацыі ня маюць грунту. Літоўскі урад лічыцца з прававымі пасьледствамі, выцякаючымі з факта адсутнасьці грамадзян-палякоў.

У Лендыне зьбіраецца канфэрэнцыя. Немцы будуць дамагацца на ёй, каб Верхняя Сілезія была прызнана за Нямеччынай.

У Лацьвіі выдадзен загад аб дэмабілізацыі двух гадоў.

У Нямеччыне камуністы падгагаўляюцца выклікаць паўстаньні 1 сакавіка (марца).

У Англіі адкрыўся парламэнт прамоваю караля аб важным значэньні лёндынскай канфэрэнцыі і ангельска-расейскіх перагаворах.

Бальшавікі абязьвініваюць свой напад на Грузію тым, што Грузія быццам паслала свае войскі ў сумежную армянскую рэспубліку для спыненьня камуністычнага руху.

У Польшчы скончыліся забастоўкі у зялезна-дарожных майстэрнях.

У Румынію у Будапэшт прыехалі генаралы штаба Врангеля і большасьць яго міністраў.

У Сірыі французы занялі Айнтаб. Нацыяналісты-туркі здаліся.

У Грэцыі староньнікі караля стараюцца дайсьці да згоды з староньнікамі Кемаля, каб даць магчымасьць туркам выступіць проціў Францыі.

Панядзелак, 21 лютага 1921 г.

Замах на Кнорына. Тэлеграма „Руспрэса" з Баранавіч паведамляе, што ў Менску быў зроблен замах на вядомага беларускага камуніста Вільгельма Кнорына. Хто страляў—уцёк. Кнорын лёгка ранены.

Аўторак, 22 лютага 1921 г.

Плебісцыт. *Варшава*, 21 лютага (E. F.). Бэрлінская прэса паведамляе, што Літоўскі ўрад даець сваю згоду на плебісцыт у Віленшчыне з умоваю, што ён адбудзецца не раней за 8 месяцаў з момэнта эвакуацыі войскаў ген. Жэлігоўскага.

Серада, 23-га лютага 1921 г.

Нота Літвы Лізе Народау вымагае, каб Вільня, як нацыянальны і гаспадарчы цэнтр Літвы, перайшла да Літоўскае рэспублікі без плебісцыта.

Гальваноускі, быўшы старшыня міністраў Літоўскае рэспублікі, прыехаў з Лёндына ў Парыж, каб быць прадстаўніком Літвы ў Лізе Народаў.

Турцыя. Султанскія міністры пакідаюць султана і пераходзяць на бок Ангорскага ўраду, к Кемалю-пашы.

Чацьвер, 24 лютага 1921 г.

Плебісцыт. Жэнева, 23 лютага (Е. Е.). У сваім адказе плебісцытнай камісіі Лігі Народаў, Літоўскі ўрад згаджаецца на плебісцыт з умоваю, што ён будзе таксама зроблен і ў Горадзеншчыне, якая ніколі не належала Польшчы.

Плебісцыт і голад. *Варшава*, 23 лютага (Е. Е.). Камісія Лігі Народаў зьвярнулася з прапазыцыяй назваць спажыўчыя прадукты, патрэбныя т. зв. Сярэдняй Ліцьве, бо плебісцыт не нормален у згаладнялай староньцы.

Грузінска - бальшавіцкая вайна нарабіла полаху ў Англіі, бо тая, прызнаўшы Грузію de jure (па праву), пазычыла ёй $2^1/_2$ міліёны фунтаў стэрлінгаў.

Розныя весткі.

Пагроза Гэндэрсона.

Правадыр ангельскіх работнікаў Гэндэрсон пагражаець, што калі безработным не дадуць работы, навет і памяркоўны элемэнт адважыцца на актыўныя выступленьні.

(«N. F. P.»).

Колькі ужо сплаціла Нямеччына.

Парыжскія газэты вылічаюць, што Нямеччына да гэтага часу ўжо заплаціла толькі контрыбуцыі, колькі не заплаціў яшчэ ніводзін народ. Яна дала саюзьнікам рознымі таварамі, баявым матар'ялам на 13 — 14 міліярдаў золатам. Але гэта складаець нязначную частку таго, чаго дамагаецца ад яе Антанта.

Правінцыяльны аддзел.

Няма чым... дык лыкам.

(Вёска Хажава, Маладэчанскай вол.)

У лістападзе месяцы прошлага году ў нашай вёсцы адчынілася беларуская школа, дзякуючы ўраду Сярэдняй Літвы, які пазволіў адчыняць беларускія школы.—Мы шчыра вітаем гэты добры пачатак! У прошлым годзе ўрад Усходніх Крэсаў таксама пазваляў адчыняць беларускія школы, але толькі на паперы, а на дзеле дык трэ было знайсьці вучыцеля ангела, каб школьнае начальства зацьвердзіла яго і пазволіла яму вучыць на роднай мове. У гэтым годзе школьная справа стаіць лепей. Дзеля адчыненьня і адбудаваньня школы ў нашай вёсцы шмат папрацаваў знаёмы нам, добра сьвядомы беларус-вучыцель А. Гайка. Гэты вучыцель яшчэ пры бальшавіках стараўся адчыніць 2-х клясовую беларускую школу для нашай і другіх вёсак. Яму прыходзілася многа змагацца з чырвонаармейцамі, якія разруйнавалі школьны будынак. — Ен таксама ратаваў ад разбурэньня і другія скарбовыя будовы (прыкладам парафіяльныя). Ня раз ён ратаваў сялян ад бальшавіцкіх рэквізыцыяў і радаю і дзелам, за што ня раз пагражалі яму арэштам.

Дык за дабро, усягды чалавеку плоцяць злом. Ня ўсьпела яшчэ добра умацавацца наша школа, як ужо паявіліся прашкоды з боку тых; якім колець у вочы, што нашыя 55 дзяцей маюць шчасьце вучыцца на сваей роднай мове. Але кажуць так: калі Бог каго хоча скрыўдзіць, дык адніме розум. — Вось і ў нашай вёсцы, чы каля вескі, ёсьць гэткія, у якіх Бог адняў розум. Яны яшчэ да гэтых часаў ня ведаюць, хто яны і з якой планэты зваліліся. Дык вось з гэтакіх калекаў, баламутаў, знашоўся такі, каторы нядаўна памясьціў у варнэй віленскай польскай газэце стацьцю над загалоўкам: „Беларуская прапаганда". Аўтор гэтага пасквіля выліваець цэлы цэбар гразі на беларускую справу, паганіць чэснае імя вышэйупамяненага вучыцеля, кажучы, што ен пры бальшавіках быў бальшавіцкім вучыцелем-агітатарам, а цяпер вядзе беларускую прапаганду. І шмат іншага пісана.

Усё гэта хбеда і лгарства. Няхай бы аўтор проста прызнаўся ў сваёй стацьці, што яму не падабаецца беларуская школа, чымся пісаць плёткі на чалавека. Але гэта выходзе як раз па прыказцы: няма чым .. дык лыкам.

Хмуры.

Вёска Сенькеняты.

(Трабскае воласьці, Ашмянск. павета).

Становішча тут з усіх старон вельмі цяжкое. Ближэйшыя вёскі выразна адбіваюць супроць беларускі настрой старых, як рэзультат чужацкага ўплыву. Каб мець дзяцей у руках, трэба сыграць на струнах старых: нічога ў іх не пра-

сіць, апрача дзяцей. Дзеля гэтага трэба, каб вучыцель прыехаў у вёску, маючы грошы да жыцьця (3—4 т. марак), 50—60 кампляктаў кніжак, сшыткоў і алаўкоў і хоць невялікія грошы (1—3 т. марак) да найму будынку пад школу, дзе няма старога. Да гэтага — трэба каб вучыцель крэпка стаяў на ідэйным грунце і не карыстаўся польскай ці маскоўскай мовай дзеля выяўленьня сваей вучонасьці і наагул культурнасьці. Трэба прывучаць відзець вучонага чалавека ў беларускай мове і абліччу. Працуючы над малымі ў дзень, вучыцель павінен працаваць над старымі ў вечар, дзеля чаго трэба, каб ён меў газэту, якая прыцягне да яго цікавых, а за імі і другіх; каб ён меў кніжкі па гаспадарцы, якія прыцягнуць сялян на параду, а ўсё гэта наагул прывучыць сялян глядзець на нас і на сябе, як на прадстаўнікоў нацыі культурнай і пабудзіць у іх пачуцьцё самапаважаньня. Пішу аб гэтым за тое, што лічу народных вучыцялёў тымі працаўнікамі, якія адны толькі змогуць вытварыць той фундамэнт, на якім зможаць збудавацца наша бацькаўшчына, і тымі ваякамі, якія адны толькі змогуць вызваліць нашых гінучых братоў з іх нядолі.

Вучыцель А. Р.

Беларускія Школы

ў Гальшанскай, Трабскай і Юрачыскай валасьцёх Ашмянск. пав.

Дадатак к справаздачы аб працы ад 30/І 1921 г.

Дзеля таго, што я быў назначаны ў гэты раён досіць позна ў концы сьнежня мес 1920-га году — і дзеля няхвату вучыцялеў на мясцох і немагчымасьці прывезьці іх з Вільні,—мною было заложана толькі шаснаццаць беларускіх пачатковых школ Гэта зусім мала, раўнуючы з працай маей у прошлым 1919—1920 г. ў Баранавіцкім павеце.

Сьпісак школ з назовам вучыцялеў і лікам вучняў прыкладаю ніжэй:

Гальшанская валасьць.

1) м. Гальшаны Е. Юзьвюк 35; 2) вёска Карабы Л. Раманцэвічанка 42; 3) вёска Міхалоўшчына Данілевіч 45; 4) вёска Пашкішкі Ул. Юрэвіч і К. Дрэвацень 55; 5) вёска Новосады Я. Дубнік 30; 6) вёска Козлоўшчына і Дарчішкі П. Хопька і К. Віткоўскі 50; 7) вёска Валовікі В. Гулько 37.

Трабская валасьць.

1) вёска Сенкеняты А. Райчонак 40; 2) вёска Позьнякі М. Ахрамовічанка 32; 3) вёска Чышэйкі Я. Багушэвіч 35; 4) вёска Куцькі Я. Лавыш 37; 5) вёска Коўшары С. Добраловіч 32; і 6) вёска Мількі М. Стэфановіч 34.

Юрачыская валасьць.

1) м. Юрачышкі Ул. Мусік 30; 2) вёска Доўгардзішкі А. Садоўскі 33; 3) вёска Верашчакі Ф. Стэфановіч 31.

У кожнай школе выкладаецца пяяньне беларускіх народных і харавых песняў.

Школьны Інструктар С. Шыманскі.
19 10/ІІ 21 г.

Горадня.

Беларуская Школьна - прытулковая Рада.

Пасьля зачыненьня польскімі ўладамі Горадзенскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту, для апекі над беларускімі школамі і прытулкамі была выбрана Беларуская Школьна-прытулковая Рада, у склад якой ўвайшлі: інспэктар гімназіі Тамашчык (старшыня), Міхаліна Мараўская, Алеся Смоліч, Надзея Міхайлоўская, Серафіма Кішко і Уладзімір Курбскі.

Рада зразу-ж прыняла пад сваю апеку беларускі дзіцячы прытулак, дзе цяпер знаходзіцца да 150 дзяцей, які пасьля заарыштаваньня некаторых сяброў камітэту і забраньня кніг Камітэту і Дабрачыннага Аддзелу, апынуўся быў у крытычным становішчы. Некалькі дзён у прытулку саўсім не было апалу і хлеба. Цяпер жыцьцё прытулку значна палепшылася, і Рада мае на днях заснаваць новы беларускі прытулак, аддзяліўшы туды частку дзяцей з першага.

Што да школьнай справы, дык Рада дагэтуль абмяжоўвалася апекай над беларускімі школамі толькі ў самай Горадні, але цяпер мае пашырыць сваю працу і на павте.

Дзякуючы удачнаму складу Рады, яна карыстаецца поўнай пашанай сярод беларускіх кругоў Горадзенскага грамадзянства.

М.

Горадзеншчына.

„Straż Litwy“ паведамляе, што Прэзас Саюзу Беларускіх Коопэратываў Е. Грыцук асуджан на 4 гады цяжкай працы.

Беларускія коопэратывы—2 у Горадні і 14 на правінцыі не дастаюць прадуктаў, ў той час калі польскія коопэратывы карыстаюцца рознымі льготамі і дапамогамі. Беларускія коопэратывы не дастаюць дазволу на ўтрыманьне інструктароў. Блізка 100 вёсак прасіла аб дазволе адкрыцьця беларускіх школ; не пазволілі адчыніць ані воднай. Тых, якія падпісаліся на просьбе аб адкрыцьці школы, прасьледуюць. У вёскы Малая Бераставіца пабілі прасіцеляў, 16 з іх заарыштавалі. Пабілі і арыштавалі вучыцялёў, якія без дазволу ўлады вучылі дзяцей пабеларуску, напрыклад Якубецкага ў Коцеўцы, Трыпузу ў Малай Берастаўіцы.

Меншчына.

— Беларускае Тэл Агенства з 12 лютага арганізавала ў Менску «Вусную газэту», якая можа быць прачытана ў любы час адмысловымі чытаньнікамі на фабрыках, у вайсковых часьцях, работніцкіх клюбах і г. д.

— 1-га лютага ў Менску адчыніўся 1-шы зьезд працаўнікоў соцыяльнага абасьпечаньня Беларусі. Зьехалася 20 дэлегатаў. З дакладу Камісарыята Соц. Аб. відаць, што на яго коштах знаходзіцца 120.000 сем'яў. Зьвернена асаблівая ўвага на паступовую натуралізацыю ўсіх відаў дапамог. На Беларусі да 20.000 спаленых сялянскіх гаспадарак, процэнт бясконных дасягае ў некаторых месцах 55-65. Пагромленых 200.000 чалавек. Камісарыят распачаў будоўлю хат, арганізаваў спажыўчыя лятучкі, выдае пацярпеўшым соль і мануфактуру. Коштапіс на будоўлю сялянскіх хат дасягае 60 міліярдаў рублёў, солі выдана 10.000 пудоў, апроч таго, троху зялеза і вобую. У Менску адчынен інвалідны дом. Мазырскі павет, які найболей пацярпеў ад балахоўцаў, дастаў 25.000 аршын мануфактуры. На адбудову гаспадарак в. Казулічы дастала 1.000.000 руб., в. Маркавічы 10 000.000 руб. і г. д.

— На сходзе Менскай арганізацыі камуністаў 7 лютага, пасьля даклада А. Мясьнікова аб ролі і заданьнях прафэсіянальных саюзаў, «за Леніна» пададзена 261 галасоў, «за Троцкага»—71 голас. А. Мясьнікоў стаіць на плятформе Троцкага.

— 6 лютага ў Менску пачалася беспартыйная жыдоўская конфэрэнцыя.

— У дв. Ігнапічы Менск. павета адчынен народны дом з чытальняю. Трупай Беларускага дзяржаўнага тэатру быў пастаўлен концэрт-мітынг.

— У дв. Самахвалавічы народны дом са сцэнай і чытальняй адчынен вайсковай часьцю.

— У Слуцкім павеце арганізована 150 хат чытальняў. Раздадзена 80 бібліатэчных комплектаў. Патрабуюць літэратуры нязвычайна.

(Белроста).

Магілеўшчына.

XX Водле слоў грам. Агяёнка, быўшага студэнта Інстытута Народнае Адукацыі ў Магілеве, там беларуская адраджэнцкая ідэя надта моцная. Падзержываюць яе студэнты і прафэсары. Лекцыі беларускія гісторыі, якія чытае прафэсар Даўгялла, слухаюцца з нязвычайнай зацікаўленасьцю.

XX Магілеўская губэрня скасована; паўночная частка далучана да Смаленскае губ., а з паўдзённай утворана Гомельская губэрня з цэнтрам у Гомлі.

— На зьезьдзе загадчыкаў аддзелаў народнае асьветы ў Гомлі было пададзена 17 галасоў за абавязковае выкладаньне навукі ў пачаткавых школах пабеларуску і за максімальную беларусізацыю ўсіх школ. Супраціўную агітацыю вялі розныя прыблуды ў краі і „камуністы“ з быўшых абрусіцеляў.

— Сельска-гаспадарчы інстытут у Горы-Горках Магілеўскай губ. мае вялікую страту ў сьмерці вядомага ботаніка Міхаіла Васілевіча Рытава, вядомага праз адкрыты ім спосаб расьціць так званы „цьвяточны“ (кватковы) гатунак агуркоў і як аўтора цэннае навуковае працы па ботаніцы і агародніцтву. Рытаў шмат зрабіў дзеля культуры края і карыстаўся вялікімі сымпатыямі сярод усяго тутэйшага беларускага і жыдоўскага грамадзянства. Пражыўшы ўсё жыцьцё ў Горках, Рытаў плакаў ад радасьці, што дачакаўся таго часу, калі роднае места зноў мае адабраны царскімі сатрапамі інстытут. Хавалі Рытава з вялікай урачыстасьцю.

Усебеларуская Асоцыяцыя студэнцтва.

У Пятроўска-Разумоўскай сельска-гаспадарскай акадэміі ля Масквы цяпер шмат ёсьць сьвядомых Беларусаў-студэнтаў, між якіх вядомы эсэр Каладзей, Гурык Г. і інш. Найважнейшыя лекцыі стэнаграфуюцца студэнтамі у перакладзе на беларускую мову, такім чынам, у бліжэйшы час будзем мець навуковае „Земляробства Беларусі“. З прафэсароў акадэміі шмат робіць дзеля беларусазнаўства Фартунатаў, а таксама вядомы коопэратар Пракаповіч, беларус з Гарэцкага павету Магілеўшчыны. Па ініцыятыве тамтэйшага студэнцтва арганізавана «Усебеларуская Асоцыяцыя соцыялістычнага студэнцтва“. Робіцца рэгістрацыя беларускіх студэнтаў, у проэкце—курсы беларусазнаўства.

З беларускага жыцьця.

XX Цераз два тыдні Вілен. Белар. Гімназія робіць вялікі спэктакль на карысьць маламожных вучняў. Пастаўлена будзе камэдыя Крапіўніцкага „Пашыліся у дурні“, Славянскі хор сьпяе беларускія песьні, сярод якіх будуць цікавыя навінкі, дала згоду пяяць п. Ігнатава, запрашаецца іграць на скрыпцы беларускія народныя матывы п. Парус, апроч таго, будзе дэклямацыя, беларускі балет і інш.

XX У салі Вілен. Белар. Нацыян. Камітэта надоячы вывешаны партрэты Яна Луцкевіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа—мастацкай работы художніцы Ніны Сасноўскай, вучыцелькі Белар. гімназіі.

XX Вярнуўся з Лодзі ў Вільню беларускі дзеяч. Ф. Умястоўскі.

XX Вярнулася на жыцьцё ў Вільню беларуская працаўніца К. Плескачэўская (Стэфановічанка).

XX Антон Грыневіч яшчэ дагэтуль сядзіць паняволены Сабраныя „Нашай Думкай“ дзеля яго грошы 3367 польскіх марак, у тым ліку ганарар супрацоўнікаў і іншыя складкі, перасланы праз т. Дварчаніна грам. В. Грыневічу, які ходзіць даведывацца паняволенага.

XX Некаторыя студэнты—беларусы сталі хадзіць у белых „рогатынках“.

XX Беларуская кнігарня ў Ашмянах аштрафована на тысячу марак. Невядомыя людзі мелі спробу замазаць вывеску у беларускай мове. Раней гэтую вывеску у начы кралі.

XX Вучыцялі беларускіх пачаткавых школ, як піша „Виленское Слово“, не дасталі пэньсіі за студзень (январ)— „за адсутнасьцю грошы“.

Тутэйшае жыцьце

Стайковая павіннасьць.

Па загаду Час. Урад. Камісіі ўся асобы, маючыя коні, павінны даваць фурманкі дзеля патрэб вайсковых, цывільных і гмінных ўласьцей (астатніх выключна ў межах гміны) толькі па трэбаваньню на пісьме ад асобных дэпартамэнтаў ці старасты. У выключных прыпадках—па трэбованьню начальніка раёна, войта і солтыса.

Рэквізыцыю фурманак робіць выключна войт ці солтыс на моцы трэбаваньня вышэйсказаных ўласьцей. Усякія самавольныя рэквізыцыі фурманак строга забараняюцца. За рэквізаваныя фурманкі гаспадары дастаюць плату: а) за язду ўрадоўцаў (чыноўнікаў) і вайсковых за 1 кілёметр (блізка вярсты) 1 каня 5 марак; б) за фурманкі дзеля грамадзкае апрвізацыі ад 1 пуда і 1 кілёметра па 50 фэнігаў; с) за дзень язды (8 гадзін) на 1 кані—150 марак, на 2 канях—250 марак; д) за паўдня—1 конь 100 марак, 2 кані—175 марак.

Віленская біржа (гэльда).

23 лютага 1921 г.

Царскія 500 р.	2300	мар.
„ 100	450	„
„ дробныя	180—410	„
Думскія 1000 р.	720	„
„ 250	560	„
Кярэнкі	130	„
Доляры	785	„
Фунты	2900	„
Франкі	53	„
Нямецкія маркі	1430	„
Осты	1400	„
Савецкія у буйных купюрах па 5 і 10 тысяч за кожную сотню	$4^1/_2$	мар.

У Віленскім Беларускім Нацыянальным Камітэце

У Аддзел Працы пры Камітэце ў апошнія дні паступае шмат трэбаваняў на жаноцкую прыслугу.

Запіс штодзенна ў памяшканьні Камітэта (Вострабрамская, 9) ад 12 да 2 г.

Юрыдычны Аддзел

пры Беларускім Нацыянальным Камітэце ў Вільні (Вострабрамская, 9) ад 11 да 2 гадз. даець парады.

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ
Кооп. Друкарня „ДРУК“, Вострабрамская 5.